# ВЕРШЫ, ПЕСНІ, ЦЁПЛЫЯ ПАЧУЦЦІ…

**Працягвае свой юбілейны тур старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, вядомая беларуская паэтэса, празаік Людміла Антонаўна КЕБІЧ. Гэтым разам пісьменніца прыняла запрашэнне ў горад Баранавічы і сонечным жнівеньскім днём завітала ў госці да настаўнікаў беларускай і рускай мовы і літаратуры раённага цэнтра. Гучалі вершы і песні Людмілы Антонаўны. Прычым песні – у аўтарскім выкананні! Некаторыя рэфлексіі ад падзеі – вашай увазе.**



Цудоўная сустрэча адбылася ўчора ў Дзяржаўнай ўстанове адукацыі «Ліцэй № 1 г. Баранавічы». Наша паважаная Людміла Антонаўна падарыла сваю творчасць настаўнікам-філолагам горада. Паўтары гадзіны праляцелі, як адно імгненн. Гэта было сапраўднае свята музыкі і паэзіі. Сур'ёзныя вершы на патрыятычную тэму, філасофскія разважанні, бездакорныя лірычныя радкі, тонкі гумар – усё гэта гарманічна спалучаецца ў творчасці нашай дарагой Людмілы Антонаўны і прадстаўляецца аўдыторыі на такіх цёплых сустрэчах. Яшчэ цэлы вечар тэлефанавалі мае калегі і выказвалі захапленне і замілаванне самабытным талентам нашага кіраўніка. Інакш і быць не магло.

Дзякую, дарагая  Людміла Антонаўна, за свята паэзіі і музыкі, якое падарылі Вы маім калегам.

**Тацццяна ЯЦУК**
педагог, паэтка,
член Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі,
**г. Баранавічы**

**На фота:** старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь, вядомая беларуская паэтэса, празаік Людміла Антонаўна КЕБІЧ выступіла перад настаўнікамі-філолагамі горада Баранавічы (Брэсцкая вобласць). Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Ліцэй № 1 г. Баранавічы». 26 жніўня 2026 года.








Жыццёвыя путы
Неба ў дыяментах